Чэмпіёны

# «Падбярэш залаты ключык да кожнага саперніка — будзе і табе «золата»



**Дагэтуль лепшым вынікам 25-гадовага Сяргея Краўчанкі было трэцяе месца на чэмпіянаце Еўропы па тайландскаму боксу (муай-тай), але не так даўно ён стаў першым у свеце. Гэта было не толькі першае «золата» байца, але і мінскага клуба «Булат» (клуб створаны менш за год таму), за які выступае спартсмен. Калі верыць спецыялістам, то беларус быў для сапернікаў цёмным конікам, усе дзіву даваліся, калі ён перамог у Тайландзе. Канешне, Сяргей пакуль толькі раскручваецца, яго не настолькі ведаюць, як тытулаванага Андрэя Кулебіна, і ўсё ж я яго адразу пазнала... па сіняку пад вокам. Сіняк, зразумела, яму «падарылі» на чэмпіянаце свету, дзе Сяргей дэбютаваў у новай для сябе вагавай катэгорыі ў 91 кілаграм. У галоўным баі наш майстр муай-тай выйграў па ачках.**

— Самым цяжкім боем быў, без сумненняў, фінальны, — узгадвае Сяргей, — бо расіянін аказаўся цяжэйшы за мяне, але мы прафесійна спрацавалі з трэнерам, таму я і змог стаць першым. Дарэчы, мой сіняк з гэтай сустрэчы. У тым, што я выступаў у больш высокай вагавай катэгорыі, быў свой плюс: некаторым патрэбна скідваць вагу, а мне можна было дастаткова есці, бо я звычайна важу 87 кілаграмаў і мог яшчэ чатыры кіло прыбавіць, свабодна піць ваду.

**— Як лічыш, ты выйграў, таму што сапернікі цябе недаацанілі, не разглядалі як фаварыта і расслабіліся?**

— На кожны бой я настройваўся, як на апошні, таксама разумеў, што да кожнага саперніка патрэбна свая тэхніка, прыглядаўся, як з кім працаваць, бо калі не знойдзеш залаты «ключык» да саперніка, выйграць немагчыма. Шмат для маёй падрыхтоўкі і выступлення на чэмпіянаце свету зрабіў трэнер Юрый Булат. Акрамя таго, пасля «Еўропы» я глядзеў на бой на чэмпіянаце свету іншымі вачыма.

**— Гэты чэмпіянат быў прысвечаны 80-годдзю тайскага караля. Як беларусам дазволілі выйграць у сямі баях і атрымаць кубак за першае каманднае месца ў такі юбілейны год у Тайландзе?**

— Каманда Тайланда апынулася на другім месцы з чатырма медалямі. Мы далі ім добры бой. Безумоўна, перамогу проста так не аддаюць. Толькі дзякуючы таму, што ў нас добрая школа, наша каманда і ўзяла першае месца.

**— Наогул Бангкок, мясцовая кухня табе спадабаліся?**

— Гуляць па гораду пры мясцовым спякотным клімаце ў мяне жадання не было, ды і аглядаць вуліцы і славутасці ў час чэмпіянату свету я проста не мог сабе дазволіць. Той, хто прайграў свой бой, мог пагуляць па гораду. Я ж лічу, што тытул чэмпіёна свету каштаваў таго, каб не пабачыць Тайланд. А мясцовая кухня на аматара. Шмат вострага. Стравы прыгожа выглядалі, але рызыкаваць перад боем не хацелася, каб страўнік не барахліў. Еў садавіну, піў сокі.

**— Удалося назіраць за ўмовамі трэніровак тайцаў?**

— Так. У іх, наколькі мне падалося, трэніроўкі больш цяжкія фізічна, заняткі праходзяць на вуліцы.

**— Даўно хацела пацікавіцца, у чым сэнс рытуальнага танца, які традыцыйна выконваюць баксёры перад боем?**

— Звычайна перад боем сябе накручваеш, хвалюешся, а танец задае пэўны настрой перад паядынкам. Са старажытных часоў лічылася, што такім чынам з'яўляецца дапамога духаў. У кожнага байца свой рытуальны танец, нават розны выраз твару. З боку гэта выглядае нават смешна, але калі ты пачнеш займацца і адчуеш усё, то зразумееш, што калі не станцуеш, псіхалагічна надломішся. У прынцыпе ўсё залежыць ад жадання чалавека. Напрыклад, я не выконваў рытуальны танец на чэмпіянаце свету.

**— А магчыма адмяніць музыку ў час бою?**

— Наўрад ці. Тайландская музыка (гучаць валынка і барабаны) не перашкаджае, а, наадварот, дапамагае, бо супакойвае і задае рытм бою: у пачатку паядынку музыка больш зацягнутая, а ў канцы паскараецца. Калі вы прыгледзіцеся, то заўважыце, што байцы сапраўды наносяць удары ў такт музыцы — спачатку ідзе разведка, абмен ударамі і ў канцы сустрэчы сапраўдная атака.

**— Чаму бай ў муай-тай называюць вольнай схваткай, нават васьмірукім боксам?**

— У боксе працуеш рукамі, а ў нас яшчэ і нагамі. Стыль барацьбы вольны, жорсткі, ды і ў адрозненне ад прафесійных баёў у аматараў няма шлемаў, жылетаў, шчыткоў. Любое дакрананне прыводзіць да рассячэнняў. З-за гэтага не заўжды транслююць баі па тэлебачанні.

**— Цяжка ставіць удар нагой?**

— Усё адбываецца паступова. Ніхто цябе не збіраецца траўмаваць, існуе спецыяльная школа, пажадана каб была добрая расцяжка.

**— Класічнае пытанне: у паўсядзённым жыцці свае ўменні прымяняў?**

— У мяне такая праца, што гэты вопыт карысны. Я ахоўнік у казіно «Princess». Сіла — апошняе, што трэба прымяняць, гэта крайні выпадак, а лепей пастарацца паўплываць словамі, знайсці агульную мову з кліентам, супакоіць яго.

**— Хто ў асноўным прыходзіць у казіно?**

— Прыходзяць людзі, у якіх ёсць грошы.

**— А пакідаюць без іх?**

— Ёсць вельмі азартныя людзі, для якіх акрамя казіно іншых інтарэсаў у жыцці не існуе, але гэта ўжо хвароба.

**— Ты сам чалавек азартны?**

— Як любы малады чалавек люблю прыемна правесці час, папіць піва.

**— Ты ўжо выканаў мінімальны план для мужчыны — пасадзіў дрэва?**

— Нават ужо дом будую, праўда разам з бацькамі. Канешне, дапамагаюць і спецыялісты.

**— Цябе на тайландскі бокс прывёў сябар. А сам кагосьці запрасіў у клуб?**

— Канешне. У апошні час многія цікавяцца тайландскім боксам. Пытаюцца ў мяне, як, што. Просяць нешта падказаць. Я з задавальненнем даю парады.

**Гутарыла Ірына ПРЫМАК.**

Глядзіце!

# ЦЫРК ПАЕХАЎ, А ШОУ ЗАСТАЛОСЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сёння ўвечары праект АНТ «Зорны цырк» фінішуе, і вызначыцца, хто ўсё ж стане пераможцам і атрымае галоўны прыз — аўтамабіль «Пежо-207». У фінальным справаздачным выступленні, дзе засталіся ўсяго пяцёра артыстаў, адзін з іх пакінуў шоу па намінацыі — у выніку глядацкага галасавання, другі выбыў з барацьбы па волі журы — набраўшы менш за ўсіх балаў. Такім чынам, засталіся толькі тры сапернікі.**

Мацнейшага — або найбольш удачлівага — вызначаць тэлегледачы. Пасля трансляцыі шоу будзе дадзена паўгадзіны на прамое тэлефоннае галасаванне (прычым званкі са стацыянарных тэлефонаў абяцаюць бясплатныя). Потым адбудзецца прамое ўключэнне з тэлестудыі, і шчаслівчыку дастанецца, акрамя масавай любові, новы чатырохколавы сябар, а іншым фіналістам — хвіліна славы і больш сціплыя прызы. І хоць чакаць да завяршэння першага беларускага рэаліці-шоу засталося некалькі гадзін, інтрыга ўсё ж захоўваецца. Літаральна на фінішнай прамой лёс скасавурыўся ў бок спявачкі Алены Грышанавай, якая дык і намінантам на вылет ні разу не была. Проста за фінальнае сваё выступленне (у цырку, паводле прымхаў, не прынята казаць «апошняе») Алена атрымала менш за ўсіх балаў. Нягледзячы нават на тое, што ў яе менавіта ў гэты дзень быў дзень нараджэння.

Дарэчы, інфармацыя спецыяльна для тых, хто перакананы, быццам грошы вырашаюць усё: па выніках апошняй намінацыі перамогу атрымалі не фінансавыя структуры, а педагагічны падыход — за віцебскага настаўніка Паўла Кежу паступіла на 4 тысячы больш галасоў, чым за намесніка гендырэктара банка Юрыя Каштанава. Усяго ж на гэты раз тэлегледачы праявілі небывалую актыўнасць — 23 202 галасы!

Пераказваць 8-ае шоу больш падрабязна дзеля разнастайнасці мы не будзем — ужо ў апошні раз можна шоу і паглядзець. А вось падвесці пэўныя вынікі са сваіх пільных назіранняў — нездарма журналісты хадзілі ў цырк, як на працу — відаць, трэба.

Кошт галоўнага прыза рэаліці-шоу, аўтамабіль «Пежо-207», ацэньваецца прыкладна ў 14 тысяч долараў ЗША.

### Каментарыі з першых вуснаў

**Сяргей ХОМІЧ, прадзюсар «Зорнага цырка»:**

— Чаму ўвогуле праект быў падоўжаны? Планавалася ж, што ён завершыцца 10 сакавіка, а фіналістаў будзе шасцёра...

— Фармату шоу ніхто не мяняў. Мы заключылі з галандскай кампаніяй «Endemol» кантракт на 8 шоу, 8 іх і пакажам. Праект падоўжыўся на тыдзень, бо адно шоу было перанесена з-за трансляцыі Кубка Дэвіса. Што ж датычыцца ўдзельнікаў — як памятаеце, двое з іх выбылі па прычыне траўмы. Інакш было б якраз шасцёра.

— Ці запланаваны гала-канцэрт, або, можа, гастролі? Тым больш адзін з расійскіх гасцей — членаў журы, як быццам абяцаў дапамагчы...

— Думаю, гэта было, хутчэй, сказана дзеля прыгожага слоўца. Мы самі пакуль нічога не плануем — ні гала-шоу, ні выязных канцэртаў.

**Ягор ХРУСТАЛЁЎ, вядучы праекта:**

— Расійскі Першы канал запусціў аналагічнае шоу «Цырк з зоркамі». Беларусам удалося ў чымсьці «пераплюнуць» расіян?

— Я бачыў толькі адно расійскае шоу, таму судзіць пакуль не магу. Але факт застаецца фактам — мы ўпершыню зрабілі праект раней за расіян. Зразумела, у нас абсалютна несупастаўныя бюджэты — але гэта вельмі дарагое мерапрыемства ў прынцыпе. (У кулуарах кажуць, быццам адзін выпуск «Цырка з зоркамі» абыходзіцца ў 250 тысяч долараў. — **Аўт.**). Напрыклад, мы шылі ўсе касцюмы, давялося самастойна рабіць вельмі многа рэквізіту, аплачваць работу ўсіх цыркавых спецыялістаў — увогуле ўсе выдаткі па вытворчасці шоу ляглі на АНТ.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Многія заўважылі памяркоўнае, так скажам, стаўленне ўсіх складаў журы да «зорак». Можа, варта было набраць у праект толькі іх?

— Зараз ужо многія згадзіліся б пайсці, а напачатку, калі мы абвясцілі кастынг, ніхто не ведаў, што і як будзе. Напрыклад, спявачка Алеся была ўжо гатовая да ўдзелу, але калі даведалася, што давядзецца на 4 месяцы адмовіцца ад гастроляў, — не вырашылася.

— А вам ніколі не хацелася памяняцца з удзельнікамі месцамі?

— Шчыра кажучы, часам хацелася. Але, па-першае, я бачыў і разумеў, якая гэта каласальная работа, якая «з'ядае» ўвесь час і сілы. А па-другое, быў вельмі заняты тэлевытворчасцю. Прыйшоў да высновы, што мне цікавей ствараць шоу, а не ўдзельнічаць у ім самому.

— Да артыстаў прывязваешся, як да родных... Ваш асабісты фаварыт застаўся ў праекце або пакінуў яго?

— Прызнаюся — я хварэў не за «зорак». З дзяўчат мне вельмі падабалася Света Белазерскіх, з хлопцаў — Віктар Арцёмаў. На жаль, абодва пакінулі шоу. І, на жаль, шоу завяршаецца. Але сумаваць асабліва няма калі — хутка ў нас запускаецца новы праект. Сам я там зноў жа ўдзельнічаць не буду, а вось сувядучую «Зорнага цырка» Вольгу Палякову вы ўбачыце ў ролі канкурсанткі.

**Ганна МАЦЮКОВА, удзельніца рэаліці-шоу (пакінула «Зорны цырк» пасля першага ж выступлення):**

— Ці крыўдна было пакідаць праект так адразу, пасля першага шоу? Ну, больш крыўдна, чым пасля другога, трэцяга і гэтак далей, напэўна... Хоць многія могуць лічыць інакш. Да таго ж для мяне цырк не скончыўся з выхадам з манежа — я працягвала прыходзіць на трэніроўкі, глядзець, як усе рыхтуюцца, часам нават сама трэніравалася. Таму і не магу адэкватна ацэньваць, з пазіцыі гледача, якія нумары спадабаліся найбольш, а якія найменш — я практычна ўсе іх бачыла ў працэсе падрыхтоўкі...

— Тым не менш, вы за кагосьці «хварэеце» або аднолькава падтрымліваеце ўсіх?

— На праекце склаліся пэўныя чалавечыя адносіны, так што я за многіх удзельнікаў перажывала і «хварэла». Вельмі шкада, што здарыліся непрыемнасці з Наташай Радзінай і Сяргеем Савіцкім, бо яны былі годнымі прэтэндэнтамі на перамогу — не таму, што вядучыя АНТ, а таму, што сапраўды вельмі адказна, з усёй самааддачай падыходзілі да гэтага праекта. Ёсць і свае перавагі, аднак, можна, напярэдадні фіналу я не буду пра іх казаць? Дарэчы, было многа размоў наконт «зорак» і «не-зорак». Я, калі ішла на праект, не ведала, як сябе з імі паводзіць. Але зрабіла для сябе нечаканае адкрыццё: некаторыя «не-зоркі» аказаліся больш ганарлівымі і складанымі ў стасунках людзьмі, а вядомыя персоны, наадварот, былі вельмі адкрытымі і добразычлівымі.

### Шоу павінна працягвацца!

Перыяд зацішша на АНТ працягнецца зусім нядоўга. Напрыканцы сакавіка стартуе праект «Дзве зоркі» (расійскую версію гэтага праекта рабіў летась Першы канал). 13 творчых пар, дзе адзін удзельнік — прафесійны выканаўца, а другі — так скажам, аматар будуць змагацца за званне лепшага дуэта.

Каго ўбачым і пачуем? Зорак тэлебачання, моды, кіно і спорту. Напрыклад, Ілля Міцько «спяецца» з Элеанорай Язерскай, Вікторыя Алешка — з капітанам каманды «Што?Дзе?Калі?» Алесем Мухіным, Аляксей Хлястоў — з Юляй Раскінай, Іна Афанасьева — з рэзідэнтам «Comedy Club» Яўгенам Булкам, Анатоль Ярмоленка — з дырэктарам Нацыянальнай школы прыгажосці Вольгай Сярожнікавай, оперны спявак Вадзім Громаў — з Вольгай Паляковай, Георгій Калдун — з актрысай Валерыяй Арланавай і, нарэшце, Павел Клышэўскі — з «Міс Беларусь-2006» Кацярынай Літвінавай. Правілы гульні ўжо знаёмыя: на фінішы павінен застацца толькі адзін. Дакладней, адна — пара. Астатняе — пакуль сакрэт. Як кажуць, не забудзьцеся ўключыць тэлевізар...

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

### Цырк у лічбах

Працягласць праекта склала 4,5 месяца — на пачатку лістапада 2006 года быў абвешчаны кастынг, з 1 снежня пачаліся здымкі.

Ад 25 да 50 гадоў — менавіта такі ўзроставы цэнз прымяняўся ў працэсы адбору будучых цыркавых артыстаў.

Колькасць заявак на ўдзел у «Зорным цырку» перавысіла 1000, але адабрана, паводле ўмоў, было ўсяго 12 чалавек.

Самую нізкую адзнаку — 2 балы — атрымала на першым шоу Святлана Белазерскіх. А выставіла гэту ацэнку Элеанора Язерская. (Ну нічога, у хуткім часе ёй самой давядзецца адчуць на сабе прыдзірлівасць журы — гл. ніжэй).

Самую высокую адзнаку — 10 — першым з удзельнікаў «Зорнага цырка» атрымаў Віктар Арцёмаў.

Лідарам па частаце намінацый на вылет з шоу, безумоўна, стаў Юрый Каштанаў — 4.

Птушкамі самага высокага палёту могуць лічыцца Люся Лушчык, Віктар Арцёмаў і Вячаслаў Харанека — менавіта іхнія нумары былі пастаўлены пад самым купалам цырка, на вышыні 5-паверхавага дома.

# ВОСЬ ТАКАЯ ВАРАЖБА — І НАДЗЕЯ, І ЖУРБА...

**Вывучаць фальклор лепш, канешне, у глыбінцы. Паехаў туды ў экспедыцыю — і слухай песні вяскоўцаў ды сам да іх далучайся. Прынамсі, так і робяць рупліўцы, дзякуючы якім жыве народная песня і слова. Але можна абраць і іншы шлях: сабраць народныя гурты з розных раёнаў Беларусі і зрабіць канцэрт у сталіцы — каб самая прадузятая і крытычная публіка падумала пра тое, хто будзе спяваць гэтыя песні далей?**

Публіка гэтая — навукоўцы, фалькларысты, этнографы і студэнты ўніверсітэта культуры, якія ў сярэдзіне сакавіка прымалі ўдзел у Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі па праблемах фальклору. Тыя, хто цікавіцца фальклорам, мелі магчымасць адчуць яго ў дзеянні падчас спецыяльна арганізаванага канцэрта этнаграфічных гуртоў Жыткавіцкага, Салігорскага, Пінскага і Чавускага раёнаў. Разам з каларытнымі народнымі выканаўцамі выступалі і тыя, хто пераймае беларускі фальклор, працягвае яго жыццё, былі і госці з Літвы — гурт «Арынушка». Хоць любіць фальклор «у натуры» — адно, а вывучаць і аналізаваць яго ва ўніверсітэцкіх сценах — зусім другое. Больш плёну будзе, калі два гэтыя метады спалучаюцца.

Гэта адбылося на канферэнцыі, дзе, акрамя выступленняў навукоўцаў, было месца для музыкі і спеваў. Адкрываючы канферэнцыю, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў прафесар Ядвіга Грыгаровіч падкрэсліла, што важна не проста вывучаць бытаванне фальклору, але і пераймаць яго ад тых пакаленняў, што ўзялі яго ад сваіх дзядоў, зберагі і данеслі да сённяшняга дня. Шмат што залежыць ад сённяшняй моладзі, у прыватнасці выхаванцаў універсітэта культуры. Каля 90 навукоўцаў прынялі ўдзел у рабоце розных секцый і «круглага стала», былі госці з Ягелонскага ўніверсітэта польскага горада Кракава. Але галоўная загадка беларускага фальклору ў тым, што больш яго вывучаеш, тым больш загакавым ен здаецца. «Рэч у сабе» — дзе слова, гук, голас заварожваюць і ператвараюць тваю душу ў адмысловы свет, у якім няма месца фальшу.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПРЫРОДНАЯ АПТЭКА

## Па лекі — у лес!



**Да з'яўлення першых зялёных лісточкаў яшчэ далёка, аднак ужо ў сакавіку—красавіку можна рабіць нарыхтоўкі некаторых лекавых раслін. Вельмі важна не прапусціць гэту залатую пару, калі ўсё ў прыродзе радуецца веснавому сонейку.**

**Якія ж расліны гатовыя падзяліцца з намі сваёй лекавай сілай? Гэта і дрэвы, і кустоўе, і травы. Назавём толькі некаторыя з іх:**

- кара вольхі, крушыны, каліны, вярбы, бярозы;
- пупышкі сасны, бярозы, таполі, чорных парэчак;
- карані і карэнішчы драсёну, дуброўкі, папаратніку, дзівасілу;
- лісце падснежнікаў (пры з'яўленні першых кветак), талакнянкі, брусьнічніку.

**Першыя лекі дапамогуць вам падтрымаць здароўе пасля доўгай зімы, умацаваць імунітэт і справіцца з абвастрэннямі хранічных хвароб.**

### Бруснічнік

Для лячэння ныркавых і іншых захворванняў, звязаных з застоем вадкасці ў арганізме, яго можна збіраць прама з-пад снегу, пакуль лісце і галінкі напоўненыя першымі, самымі карыснымі сокамі. Калі ўпусціць час, бруснічны ліст чарнее пры сушцы і губляе частку сваіх лекавых уласцівасцяў. Толькі зразайце маладыя кусцікі акуратна, каб не пашкодзіць карані. Сушыце іх у цёплым памяшканні на тонкай паперы.

### Лекавыя пупышкі

Для лячэння пупышкі дрэў і кустоў неабходна сабраць да распускання лісця, у перыяд іх набракання. Некалькі слоў аб лекавых уласцівасцях сасновых пупышак.

Іх зразаюць нажом з галінак маладых дрэў, якія растуць на лесасеках. Лякарства з сасновых пупышак добра прымяняць пры кашлі, яно дапамагае пры лячэнні запаленняў дыхальных шляхоў. У пупышках сасны многа эфірнага масла, фітанцыдаў, якія забіваюць хваробатворныя бактэрыі і вірусы. Таму, хто выпівае хоць бы 0,5 шклянкі на дзень сасновай гарбаты, не страшныя ні прастуда, ні вясновы авітаміноз. А яшчэ з яго дапамогай можна пазбавіцца ад абвастрэнняў рэўматызму і некаторых скурных захворванняў.

### Вясновыя рэцэпты

**Ад пнеўманіі** з сасновых пупышак гатуюць настойку: шклянку пупышак заліваюць 0,5 гарэлкі, дадаюць 0,5 шклянкі ліпавага мёду, вытрымліваюць у цемры 20 дзён і п'юць па сталовай лыжцы 3 разы на дзень.

**Пры бранхітах** дапамагае адвар з каранёў дзівасілу: сталовую лыжку здробненых каранёў заліваюць 2 шк. кіпеню, трымаюць на вадзяной лазні 15 хвілін, настойваюць 30 хвілін. Прымаюць адвар па 1/4 шк. праз кожныя тры гадзіны. У народнай медыцыне гэты адвар служыць і для лячэння скурных захворванняў.

Водныя адвары з маладога бруснічніку прымяняюць як мачагоннае пры цыстытах, нефрытах: бяруць 1 ст. лыжку лісця на шклянку вады, гатуюць 5 хвілін на слабым агні, настойваюць 15 хвілін і прымаюць па 1 ст. лыжцы 3—4 разы на дзень.

-2396-

САМІ З РУКАМІ

## Каркас на бетоне

**Абшываць бетонныя сцены ліставымі матэрыяламі (ДСП, ДВП, гіпсакардон і інш.) даводзілася многім гаспадарам уласных дамоў. Зрабіць гэта нескладана, калі змайстраваць трывалы каркас, які схавае ўсе магчымыя няроўнасці сцяны. Прапануем вам крыху іншую тэхналогію падобных работ.**

Сутнасць яе — у спосабе мацавання брускоў да сцяны. Дзякуючы таму, што бруски не прыцягваюцца да драўляных коркаў, забітых у сцяну, а абхопліваюць іх з бакоў, няроўнасці сцяны не маюць істотнага значэння, і каркас атрымліваецца ідэальна роўным.

Работу пачынайце, як заўсёды, з разметкі адтулін на сцяне. Спачатку пры дапамозе рулеткі і ватэрпасу пазначце вертыкальныя восі ўстаноўкі брускоў каркаса. Адлегласці паміж імі вызначаюцца шырынёй, таўшчынёй і цвёрдасцю лістоў абшыўкі, якія выкарыстоўваюцца. Інтэрвалы паміж адтулінамі ў кожнай восі — 300—500 мм **(мал. 1)**.

Адтуліны свідруйце перфаратарам на глыбіню 40—50 мм, а затым забіце ў іх на клеі бярозавыя коркі. Апошнія пастаўце так, каб іх часткі, што выступаюць, былі большыя (па 15—20 мм), чым сячэнні стоек апорнай асновы.




Мал. 1 Мал. 2

Брускі (па два на кожную вось) прыкладзіце да коркаў і пазначце месцы, дзе трэба зрабіць невялікія выбіранні паза, адпаведныя дыяметру коркаў. Папрацаваўшы крыху нажоўкай ці дрылем (брускі ў гэтым выпадку трэба змацаваць струбцынгамі ці збіць цвікамі ў некалькіх месцах), пачынайце завяршальную аперацыю па майстраванню каркаса. Стойкі навешвайце на коркі, а затым змацуйце канструкцыю цвікамі, прасвідраваўшы папярэдне скразныя адтуліны ў брусках і корках **(мал. 2)**. Застаецца толькі адпілаваць часткі коркаў, якія выступаюць, пры дапамозе нажоўкі **(мал. 1)** — і каркас гатовы.

а — у адпаведнасці з памерамі ліста абшыўкі

Мал. 1. Каркас для аздаблення бетоннай сцяны: 1 — апорныя брускі; 2 — цвік; 3 — драўляныя коркі.

Мал. 2. Вузел замацоўвання брускоў з коркам: 1 — цвік; 2 — драўляны корак; 3 — брусок.

ДА ВАШАГА СТАЛА

## Смажаніна з сухафруктамі

***1,5 кг ялавічыны, 100 г масла, 2—3 цыбуліны, па 50 г чарнасліву, курагі, разынак, сушаных яблыкаў, соль.***

Ялавічыну разрэжце на невялікія кавалкі і злёгку абсмажце на патэльні. У каструлю пакладзіце масла, дадайце дробна пасечаную цыбулю. Падсмажанае мяса тушыце разам з цыбуляй на сярэднім агні каля 1 гадзіны.

Папярэдне замочаныя чарнасліў, курагу, разынкі, сушаныя яблыкі дадайце да мяса і тушыце ўсё разам на невялікім агні яшчэ 2 гадзіны. Пасаліце прыблізна за гадзіну да гатоўнасці.

-2397-

Песню бярыце з сабою

# Апошні тралейбус

**Спакою не ведаюць юнацкія душы. Ахопленыя рамантычнымі парывамі, яны прагнуць абнаўлення ўвесь час у імклівым руху. І калі наплывае туга, скруха, яны яшчэ мацней клічуць на прастор — туды, дзе зручней яднацца духам.**

Песня «Апошні тралейбус» Булата Акуджавы — даверлівы расповед пра духоўную неўладкаванасць, пра пошук шляхоў прасвятлення. Моладзь блізка ўспрымала душэўную аголенасць меладычнага выказвання — і песня вольна ўвайшла ў студэнцкія інтэрнаты, заваладарыла за бяседным сталом. Праз дзесяцігоддзі яна ахінулася беларускамоўнай шчырасцю. Яе тэкст агучыў паэт, перакладчык, літаратуразнавец Л. Баршчэўскі. Ен прапанаваў акрыліцца рамантычнай узнёсласцю, далучыцца і вершам, і спевам да слаўных традыцый папярэднікаў.

**Міхась ШАВЫРКІН.**

**Верш і музыка Булата Акуджавы**

Калі я, не здужаўшы новай бяды,
пакутую ў роспачы змрочнай,
я ў сіні тралейбус сядаю тады —
ў апошні, паўночны.
Апошні тралейбус,
па вулках імчы,
кружыся, нясі суцяшэнне
ўсім тым, каго напаткала ўначы
крушэнне, крушэнне!

Апошні тралейбус, ляці,
не марудзь!
Я знаю, як ноччу халоднай
твае пасажыры-матросы даюць
прытулак заўсёдны.
Плячо да пляча дотык у цішыні
быў мне ад бяды ўратаваннем...
Як многа, ўявіце сабе, дабрыні
ў маўчанні, ў маўчанні.

Апошні тралейбус
Масквою плыве.
у досвітак брук выцякае,
і боль, што шпачком
стукаў мне ў галаве,
сціхае, сціхае.

*Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.*




Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Дзеваў чакае прафесійны поспех, а Скарпіёнаў — творчае мерапрыемства...



**Авен.** Вас будуць перапаўняць творчыя ідэі і задумы. Спатрэбяцца аднадумцы, якія б дапамаглі іх ажыццявіць. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі: гэта дазволіць пазбегнуць многіх памылак і наблізіць вас да здзяйснення запаветнага жадання. Верагодна вырашэнне практычна ўсіх канфліктаў і дасягненне згоды, аб якой даўно марыце. Аднак у сераду лепш не ўступаць у спрэчкі і не сварыцца з роднымі. Гэта спрыяльны дзень для прасоўвання па службе. У пятніцу пастарайцеся аб'ектыўна разлічваць сілы.

**Цялец.** Адпачывайце, пакуль ёсць магчымасць. Такой магчымасці няма? Тады трэба мець на ўвазе, што будзе вельмі цяжка засяродзіцца на бягучых справах, а ўжо пра новыя і гаварыць няма чаго. У аўторак не варта зацыкліваца на сямейных праблемах: спроба высвятлення адносінаў не толькі не праясніць сітуацыю, але забяспечыць скандал. Калі вырашыце пачаць што-небудзь новае ў другой палове тыдня, то можаце страціць на гэта ўвесь час без асаблівых вынікаў.

**Блізняты.** Пастарайцеся атрымліваць ад жыцця задавальненне, адкрыйцеся для новых магчымасцяў і сустрэч. У аўторак паклапаціцеся аб будучых важных справах. Завяршыўся перыяд спрэчак з партнёрамі, так што зараз вашай задачай будзе ісці насустрач адзін аднаму, працаваць над адносінамі. У сераду не падкупляйцеся на шчодрыя пахвалы — тады вы апыняцеся ў большым выйгрышы. У другой палове тыдня ёсць верагоднасць клопатаў і хваляванняў, звязаных з праблемамі сяброў. Пастарайцеся разабрацца ў сваім акружэнні: не выключана, што вас выкарыстоўваюць.

**Рак**. Можаце праявіць поўны спектр сваіх талентаў, хоць вам даволі часта давядзецца займацца руціннай паўсядзённай працай. Не варта ўступаць у новыя абавязацельствы на падставе дамоўленасцяў, нават калі яны падаюцца вельмі выгаднымі. Хутчэй за ўсё, будзеце разграбаць завалы на працы, каб нішто не перашкаджала вашай дзейнасці. У другой палове тыдня можна пайсці на ўзважаную рызыку. Трымайцеся з партнёрамі карэктна, але абсалютна незалежна. У пятніцу пройдуць паспяхова судовыя справы. У выхадныя не адмаўляйцеся ад прапаноў сяброў наведаць вечарыну.

**Леў.** Пажадана пазбягаць імпульсіўнасці і пастарацца не дапускаць у сваіх паводзінах непаслядоўнасці. Калі вы абыдзеце гэтыя падводныя камяні, то атмасфера вакол вас гарманізуецца і прынясе жыццёвае заспакаенне. Варта звярнуць увагу на тое, што вы гаворыце падчас зносінаў. Пачынаючы з серады, можаце ажыццяўляць планы і задумы — у гэты дзень многае будзе ўдавацца. Неабходна дакладна правяраць інфармацыю, якую атрымліваеце, — каб пазбегнуць памылак і скажэнняў. У чацвер можна, пры неабходнасці, разлічваць на падтрымку сяброў. Пятніца будзе ўдалая для завяршэння старых спраў. Нядзеля спрыяльная для творчых пачынанняў. У выхадныя знайдзіце дастаткова часу для адпачынку і забаў, а калі нядзельны вечар вы прысвяціце сям'і і родным, то не пашкадуеце аб гэтым.

**Дзева.** Сілы, якія назапасіліся, спатрэбяцца для інтэнсіўнай і плённай працы, толькі разлічвайце нагрузку, хоць як-небудзь суадносячы яе са сваімі магчымасцямі. Сіл можа і не хапіць, але часу ў сутках больш не стане. Абвостраная прынцыповасць будзе садзейнічаць дзелавому і прафесійнаму поспеху. Не здавайцеся пры першых цяжкасцях. Будзьце больш ветлівымі і адначасова больш настойлівымі: менавіта гэта тактыка — ключ да дасягнення мэты. У другой палове тыдня верагодная прапанова, якая адкрые перад вамі новыя магчымасці. Аднак у пятніцу лепш абмежавацца дробнымі бягучымі справамі і не замахвацца на большае. Побач з блізкімі людзьмі вы адчуеце упэўненасць у сваіх сілах і магчымасць ажыццявіць свае задумы.

**Шалі.** Калі ўдасца сумясціць мяккую дыпламатычнасць, неабходную на гэтым тыдні, з мэтанакіраванасцю, ніякая цяжкасць перад вамі не ўстаіць. У панядзелак магчыма паступленне цікавай прапановы, але не варта спяшацца яе прымаць. Лепш як след разабрацца ў сітуацыі. Пятніца можа аказацца складаным і неадназначным днём: магчыма, вынік доўгай і старannай працы будзе адмоўным. Але ўсё ж варта прадпрыняць што-небудзь, каб рэалізаваць свае мэты. Магчыма, давядзецца штосьці кардынальна мяняць. Не адмаўляйцеся ад дапамогі родных і сяброў.

**Скарпіён.** Праблемы на працы будуць вырашаны «малой крывёй», таму вам давядзецца асэнсаваць свой поспех і зразумець, як яшчэ раз паўтарыць яго. Пастарайцеся не паскараць вырашэнне пытанняў, якія звязаны з працай. У аўторак кожная спрэчка, кожны канфлікт могуць быць пераадолены, калі падыходзіць да пошуку рашэння творча. У пятніцу навакольныя могуць на вас забыцца. Бліжэй да выхадных можаце стаць удзельнікам ці арганізатарам творчага мерапрыемства.

**Стралец.** На працягу тыдня пажадана займацца толькі дробнымі справамі паўсядзённага характару. Калі ёсць магчымасць, паспрабуйце пазбягаць канфліктаў і сутыкненняў з начальствам. Старайцеся зносіцца толькі з важнымі і патрэбнымі людзьмі. Не хапайцеся за тысячу спраў адразу — выгадней выбраць штосьці адно і на гэтым засяродзіць усе намаганні. У пагоні за праўдай, па магчымасці, пазбягайце канфліктаў. Ісціна рана ці позна абавязкова пераможа, так што беражыце сілы. Падарожжы з пазнавальнай і забаўляльнай мэтай будуць асабліва спрыяльнымі.

**Казярог.** Можаце сутыкнуцца з нейкай акалічнасцю, якая зменіць ваша жыццё. Паспрабуйце займацца справамі, якія не прэтэндуюць на глабальнасць, бо павышаная актыўнасць на гэтым тыдні непажадана. Дзеці могуць запатрабаваць ад вас пільнай увагі. У чацвер не прапускайце важных сустрэч і кантактаў, а старайцеся развіваць на іх дамоўленасці, якія былі дасягнуты раней. У выхадныя пазбягайце новых знаёмстваў. У нядзелю не варта планаваць важныя перамовы.

**Вадалей.** У панядзелак эмоцыі, якія б'юць цераз край, могуць усё разбурыць на сваім шляху, таму лепш прытрымаць гэты вулканічны стан. Пастарайцеся не ўвязвацца ў спрэчкі. У аўторак пачынайце працаваць на свой поспех. У вашай кар'еры зараз настаў вельмі важны перыяд — прафесійныя справы патрабуюць дэталёвай прапрацоўкі і планавання. Больш асцярожна аднясіцеся да інфармацыі, якую атрымліваеце. На гэтым тыдні лепш абапірацца толькі на правераныя факты. У сераду неабходна захоўваць спакой, не парушаць ніякімі пабочнымі дзеяннямі міру ў душы. У канцы тыдня, калі ўзнікне праблема выбару паміж справамі і зносінамі з дзецьмі, лепш спыніць свой выбар на дзецях: выберыцеся разам з імі за горад, на свежае паветра.

**Рыбы.** Самы час высветліць сутнасць праблем, якія ў вас назапасіліся. У панядзелак варта падумаць аб перспектывах і, вызначыўшыся, пачынаць спакойна дзейнічаць. У вас ёсць рэальны шанц стаць сапраўдным гаспадаром становішча. Творчы настрой у чацвер дазволіць здзівіць калег і сяброў свежымі ідэямі. У сярэдзіне тыдня адносіны з блізкімі людзьмі могуць быць не такімі ўжо бясхмарнымі, але да выхадных хмары рассеюцца — і вы цудоўна правядзеце час у сямейным асяроддзі.


Насця ЗЛОЦІНА вельмі добрая і акуратная дзяўчынка, якой у сакавіку споўнілася 4 гады. Востра адчувае недахоп ласкі і пяшчоты. У яе ёсць старэйшая сястрычка.


Коля АЛЕСЕНКА падыход можа знайсці да кожнага дзякуючы сваёй ласкавасці. Цікаўны, працалюбівы, добразычлівы. У яго ёсць 6-гадовы брат Рома. Яму 5 гадоў.


Ілона ВОЛКАВА — дзяўчо актыўнае, гаваркое, чулае, добра вучыцца і паспяхова ўдзельнічае ў самадзейнасці. Ей 10 гадоў.


Даша САЛАЎЁВА старанная, любіць дапамагаць. Яе трэба адагрэць, кажа педагог. Ей 4 гады.


Даніле ГУРБО ўжо 6. Тут жыве яго сястра Рыма, з якой у хлопчыка вельмі добрыя адносіны. Хлопчык выхаваны і разумны.


Максіму МАРЧАНКУ 8 гадоў, ён марыць трапіць у сям'ю, хлопчык разумны і добры, нікому не дае засумаваць.


Крысціна ФІЛІПЧОНАК мае добрую натуру, любіць клапаціцца пра малодшых, яе называюць «маленькая мама». Ей 14 гадоў.

НОВАЯ АКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ»

# ДЗІЦЯ — самы дарагі госць у доме

Гэтую, трошкі перайначаную, усходнюю прыказку мы вырашылі пакласці ў назву новай акцыі, мэта якой — даць як мага большай колькасці дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай дзяржавы, магчымасць аздаравіцца ў сям'і. Маецца на ўвазе ў першую чаргу аздараўленне душэўнае і духоўнае. Бо фізічныя свае патрэбы дзеці ў нашых сіроцкіх установах задавальняюць неблага: у іх ёсць якасная ежа, шмат цацак... Але гэтыя дзеці не маюць галоўнага — станоўчага вопыту жыцця ў сям'і. Таму нават самыя ласкавыя і разумныя з іх так потым і не могуць пабудаваць уласную сям'ю, ды і ўвогуле жыць прыстойна.

Вопыт апошніх гадоў паказвае, што нават непрацяглае знаходжанне ў цёплай сямейнай атмасферы, асабліва там, дзе да дзіцяці ставіліся з любоўю і цярпеннем, дзейнічае на малое вельмі дабратворна. Гасцявая форма ўладкавання дзяцей даволі распаўсюджаная ў заходнееўрапейскіх краінах. Але чаму б не ў нас? Няўжо мы менш здольныя любіць? Няўжо мы абыякавыя да дзіцячага болю? Альбо ў нашых дамах не знойдзецца месца для маленькага чалавечка? І сэрцах? А можа проста трэба рашыцца? Усвядоміць, што гэта не з'яўляецца нечым незвычайным — запрасіць у госці да сябе малое, якому жыццёва неабходна адчуць, што яго нехта ў гэтым свеце заўважыў... Канешне, тут патрэбна вялікая адказнасць. Бо дзеці нізавошта не пагодзяцца проста быць аб'ектам, з дапамогай якога нехта вырашыў зрабіць «добрую справу». Яны жадаюць аднаго і толькі аднаго — быць асаблівымі, якія вымалілі, выплакалі і выпакутавалі сваё шчасце. Яны хочуць любіць і быць любімымі. Яны згодныя на тое, што тыя, хто іх любіць, па нейкіх прычынах не могуць іх усынавіць альбо забраць назаўсёды з інтэрната, дзіцячага дома. Але ж — любяць! Помняць, хвалююцца, купляюць падарункі, чакаюць у госці...


Алёшу БАНДАРОВІЧУ тры гады споўніцца толькі ў чэрвені. Ён самы маленькі ў групе, але даволі смелы: пра сябе раскажа, усё распытае. Здольны з усімі пасябраваць.

Мінскі дзіцячы дом № 6 адкрыўся ў 1998 годзе. Сёння ў ім жывуць 83 дзіцяці ад 2 да 18 гадоў. З пачатку гэтага, 2007 года, шэсць выхаванцаў ужо знайшлі новыя сем'і. Дзіцячы дом з'яўляецца адкрытым, гэта значыць, што дзеці наведваюць звычайную школу разам з «сямейнымі». Гэта дапамагае іх сацыялізацыі. Увогуле, педагогі імкнуцца па магчымасці кампенсаваць адсутнасць сям'і: навучаюць малых заварваць чай, карыстацца ўласнымі грашыма... Але ёсць рэчы, якія немагчыма забяспечыць у дзіцячым доме, напрыклад, прысутнасць мужчыны. З'яўленне сантэхніка ў групе — цэлая падзея, горка жартуюць выхавацелькі. Калі мы прыйшлі туды з фотакарэспандэнтам Анатолем Клешчуком, то трэба было бачыць, з якой гатоўнасцю яны выконвалі любую просьбу апошняга, як хлопчыкі выстройваліся ў чаргу павітацца за руку, як блішчэлі вочкі дзяўчынак ад пачутых кампліментаў...

Такім чынам, знаёмім вас з першай групай дзетак, якіх можна запрасіць да сябе ў госці. Каб трошкі ім дапамагчы ў жыцці.

Калі вырашыцеся, званіце **дырэктару дзіцячага дома САЎЧАНКА Тамары Эдуардаўне (гарадскія тэл.: 240-12-12, 340-93-32)**. Людзі, якія даўно працуюць у гэтай сферы, раяць спачатку проста наведаць дзіця, прынесці яму пачастунак, пазнаёміцца, паназіраць яго ў групе. Потым, калі кантакт адбудзецца, можна будзе сабраць неабходныя дакументы (іх усяго толькі два — акт абследавання жылля і заява). У госці таксама лепш спачатку запрасіць на выхадныя — дні на два. Трэба мець на ўвазе, што дзіця таксама выбірае. І якімі б добрымі намерамі вы ні кіраваліся, але кантакту можа не адбыцца. І вельмі важна адразу папярэдзіць малое, што размова ідзе толькі пра гасцяванне, пра сяброўства, каб яно не падманвалася, каб па магчымасці папярэдзіць альбо змякчыць псіхалагічную траўму.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**


Рыма ГУРБО — цудоўнае дзяўчо, вельмі стараннае, прыстойнае, добрае, спагадлівае, добра вучыцца. Ей 8 гадоў.


Валерыя ЖЫНКО жыве тут толькі тыдзень. Яна яшчэ не раскрылася, але бачна, што ціхая, сарамлівая, старанная. Ей 10 гадоў.


Ваня КІЦІКАЎ адрозніваецца сваёй ранімасцю. Вельмі разумны. Яму 7 гадоў.


Руслан і Рустам КЛЕТЧАНКІ — блізняты, яны ў дзіцячым доме крыху больш за тыдзень, сумуюць па сям'і і сваіх сабаках. Ім па 8 гадоў.


Ілья ДЫБОЎСКІ мае добрую натуру, любіць дзяжурыць — накрываць сталы, прыбіраць пасля заняткаў. Але можа і замкнуцца, бо вельмі перажывае сваё становішча. Яму 4 гады.


Жэню ГАЛУШКУ 9 гадоў, ён добра вучыцца, любіць чытаць кніжкі, з задавальненнем удзельнічае ў канцэртах.


Ганне ГАЎРЫЛОВІЧ 12 гадоў, яна вельмі хоча трапіць у сям'ю.

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.20 | 18.16 | 11.56 |
| Віцебск — | 6.10 | 18.06 | 11.56 |
| Магілёў — | 6.11 | 18.06 | 11.55 |
| Гомель — | 6.07 | 18.03 | 11.56 |
| Гродна — | 6.36 | 18.31 | 11.55 |
| Брэст — | 6.36 | 18.32 | 11.56 |

### Месяц

*Маладзік 19 сакавіка. Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

*Пр.* *Ульяны, Васіля, Вячаслава, Герасіма, Даніла, Паўла, Рыгора, Якава.*
*К.* *Гертруды, Рэгіны, Збігнева, Патрыка, Яна.*

## Надвор'е на заўтра




## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +6 — +8 °С | пахмурна, невялікі дождж |
| ВІЛЬНЮС | +1 — +3 °С | пахмурна, дождж |
| КІЕЎ | +5 — +7 °С | пахмурна, без ападкаў |
| МАСКВА | +1 — +3 °С | Без ападкаў |
| РЫГА | +2 — +4 °С | пахмурна, невялікі дождж |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | -1 — +1 °С | снег |

## Дзве даты

### 17 сакавіка

**1907 год** — 100 гадоў таму ў маёнтку Палевічы на Глыбоччыне была створана Першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага, дзень нараджэння першага беларускага прафесійнага тэатра. Дзейнічаў да 1913 года. Тэатр праводзіў вялікую асветніцкую работу, прапагандаваў беларускае мастацтва, садзейнічаў развіццю народнай творчасці і сыграў важную ролю ў развіцці прафесійнага тэатральнага мастацтва ў Беларусі. Гастраляваў у Мінску, Полацку, Слуцку, Пецярбургу, Вільні, Варшаве, іншых гарадах. У рэпертуары былі: пастаноўкі «Модны шляхціц» К. Каганца, «У зімовы вечар» і «Хам» Э. Ажэшка, «Мядзведзь» А. Чэхава і інш.



**1935 год** — нямецкія разведслужбы арганізавалі «ўцечку інфармацыі» ў пасольства СССР у Парыжы аб антысавецкай змове ў радах вышэйшага кіраўніцтва Чырвонай Арміі. У хуткім часе будуць арыштаваны і расстраляны шэраг вышэйшых камандзіраў, у тым ліку і першыя маршалы Тухачэўскі, Блюхер, Ягораў.

## Цытата дня:

***«Я хацеў бы славы — толькі для таго, каб асвятліць ёю магілу бацькі і калыску майго сына».***

**Пётр ВЯЗЕМСКІ (1797—1878),**
**рускі паэт.**

Інфарм-укол

## КУРЭННЕ СПРЫЯЕ РАКУ ПАДСТРАЎНІКАВАЙ ЗАЛОЗЫ

**Даследчыкі з Мічыганскага ўніверсітэта даследавалі сувязь паміж курэннем і ракам падстраўнікавай залозы і ўстанавілі, што хімічныя рэчывы, якія атрымліваюцца ў выніку курэння тытунёвых вырабаў — поліцыклічныя араматычныя вуглевадароды, (ўмешваюцца ва ўзаемадзеянне паміж клеткамі арганізма.**

Гэта не абавязкова выклікае рак, але ўносіць уклад у яго развіццё. Паколькі хімічныя рэчывы ўздзейнічаюць як прапагандысты, а не ініцыятары раку, можна лічыць, што спыненне працэсу звязана са спыненнем курэння.

## ПАЖАДАЙЦЕ БАЦЬКАМ ПРАЦЯГЛАГА ЖЫЦЦЯ

**Калі вашы бацькі перажылі 85-гадовую мяжу, то ў вас менш шанцаў, чым у тых, чые бацькі не адносяцца да ліку доўгажыхароў, пакутаваць ад гіпертаніі, павышанага ўтрымання халестэрыну і іншых праблем, звязаных з сардэчнасасудзістымі захворваннямі.**

Безумоўна, на сітуацыю ўплываюць і іншыя фактары. Даследаванне таксама паказала, што нашчадкі групы доўгажыхароў — гэта часцей за ўсё тыя, каго маці нарадзіла ва ўзросце каля 40 гадоў. Гэта можа сведчыць аб тым, што затрымка менапаўзы прыводзіць да затрымкі старэння жанчын. Ёсць таксама звесткі, што дзеці доўгажыхароў, як правіла, лепей адукаваныя, чым тыя, чые бацькі памерлі рана. Мужчыны, чые бацькі могуць быць аднесены да групы доўгажыхароў, як правіла, не кураць, іх бацькі часта таксама не былі курыльшчыкамі.

Ведай нашых!

## Сустрэча з тэатрам: яшчэ не вечар...

**У сярэдзіне сакавіка на радзіме Тараса Шаўчэнкі ва ўкраінскім горадзе Чаркасы цёпла прымалі беларусаў. Тэатр імя Янкі Купалы прадстаўляў нашу краіну на Міжнародным тэатральным фестывалі «Сцэна людства», які прымеркаваны да 193-й гадавіны нараджэння народнага паэта Украіны.**

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы другі раз за апошнія паўгода выступіў перад украінскай публікай. Услед за гастролямі ў Кіеве, ён прымаў удзел у прадстаўнічым форуме па запрашэнню яго арганізатараў. У гэтага фестывалю ёсць асаблівасць — ён знаёміць з сучаснымі версіямі класічных твораў, якія створаны нацыянальнымі рэжысёрамі розных краін. На сцэне Чаркаскага драматычнага тэатра пад заслону фестывалю гучала беларуская мова — купалаўцы прадставілі спектакль-рэквіем «Вечар» паводле Аляксея Дударава, які паставіў Валерый Раеўскі. Думкі адзінокіх старых у вёсках, якія чакаюць сваіх гарадскіх дзяцей, зразумелыя аднолькава і для беларусаў, і для ўкраінцаў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Бухгалтерский баланс ЗСАО «БелИнгострах»

за 2006 год

г. Минск, ул. Мясникова, 40, тел. (017) 203-58-78

БЕЛИНГОСТРАХ Belingostrakh

млн. руб.

| АКТИВ | | ПАССИВ | |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Основные средства | 3 374,9 | Источники собственных средств, всего | 5 812,3 |
| Нематериальные активы | 9,6 | в том числе: | |
| Финансовые вложения, всего | 548,0 | уставный фонд | 1 751,2 |
| в том числе: | | резервный фонд | 0,0 |
| инвестиции в дочерние общества | 0,0 | добавочный фонд | 3 552,5 |
| инвестиции в другие организации | 8,2 | фонд накопления | 440,0 |
| облигации и другие долговые обязательства | 539,8 | фонд потребления | 0,0 |
| прочие финансовые вложения | 0,0 | целевое финансирование | 0,0 |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 390,5 | нераспределенная прибыль прошлых лет | 68,6 |
| Дебиторы, всего | 361,8 | нераспределенная прибыль отчетного года | 0,0 |
| в том числе: | | Страховые резервы и фонды, всего | 2 785,0 |
| | | в том числе: | |
| дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 140,3 | страховые резервы | 2 777,9 |
| | | фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 7,1 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | 0,0 | гарантийные фонды | 0,0 |
| | | Кредиторы, всего | 231,7 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 221,5 | в том числе: | |
| прочие активы, всего | 3 264,4 | кредиторская задолженность по операциям страхования | 33,3 |
| в том числе: | | | |
| незавершенное строительство | 5,3 | кредиторская задолженность по операциям перестрахования | 78,4 |
| материальные ценности и затраты | 170,1 | | |
| денежные средства | 3 089,0 | депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 0,0 |
| собственные акции (доли) | 0,0 | заемные средства | 99,6 |
| прочие активы | 0,0 | кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 20,4 |
| Непокрытые убытки прошлых лет | 0,0 | | |
| Непокрытые убытки отчетного года | 906,7 | Прочие пассивы | 26,9 |
| **БАЛАНС** | **8 855,9** | **БАЛАНС** | **8 855,9** |

**Достоверность бухгалтерского баланса и отчета о финансовых результатах подтверждена ОДО «Промаудит».**

Мы проводили аудит в соответствии с Законом Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности», республиканскими правилами аудиторской деятельности, внутрифирменными правилами аудиторской деятельности, нормативными правовыми актами, регулирующими деятельность аудируемого лица.

Мы полагаем, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗСАО «БелИнгострах» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗСАО «БелИнгострах» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2006 год.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0061721 от 03.02.2004 г. выдана Минфином РБ со сроком действия по 02.02.2009 г.

**Директор «Промаудит» аудитор А.В. АНИСОВИЧ. Аудитор О.Г. ДРОЗДОВ.**

## Отчет о финансовых результатах ЗСАО «БелИнгострах» за 2006 год

млн. руб.

| *Наименование показателя* | *За отчетный период* |
|---|---|
| *1* | *2* |
| **I. Страхование жизни** | |
| Страховые взносы (премии) | 0,0 |
| Страховые выплаты | 0,0 |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 0,0 |
| Отчисления в гарантийный фонд | 0,0 |
| Расходы на ведение дела | 0,0 |
| Результат от операций по страхованию жизни (+ или -) | 0,0 |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | |
| Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование | 2 327,6 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -) | -75,5 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование | 2 111,5 |
| Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -) | 678,4 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 0,0 |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 0,0 |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 18,6 |
| Расходы на ведение дела | 1 114,2 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 109,2 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 115,7 |
| Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -) | -320,3 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | |
| Операционные доходы | 5 511,5 |
| Операционные расходы | 5 254,4 |
| Внереализационные доходы | 119,4 |
| Внереализационные расходы | 650,0 |
| Финансовый результат | -593,8 |
| Использовано прибыли | 312,9 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | -906,7 |

**Генеральный директор А.К. ХОМЯКОВ, главный бухгалтер О.И. КУРЬЯН.**

## УСМІХНЁМСЯ!

У ваенкамаце:
— І дзе хочаце служыць?
— У лётных войсках!
— Вас не возьмуць з-за павышанага ціску.
— Ну, тады ў ППА!
— А чаму так?
— Калі я лятаць не буду, дык ніхто лятаць не будзе!..

☺

**Слабыя засынаюць у салаце, а моцныя — у дэсерце!**

☺

Англічанін мае жонку і палюбоўніцу. Любіць жонку.
Француз мае жонку і палюбоўніцу. Любіць палюбоўніцу.
Яўрэй мае жонку і палюбоўніцу. Любіць маму.
Рускі мае жонку і палюбоўніцу. Любіць выпіць.

☺

**— Калі перад вамі нечакана з'явіўся леў, якія будуць вашы дзеянні?**
**— Адвольныя ці неадвольныя?**

☺

З-за неасцярожнасці кранаўшчыку спатрэбілася ўсяго тры секунды, каб злезці з крана.

☺

**— Дарагая, хочаш паехаць у тэатр на прасторнай машыне з магутным рухавіком?**
**— Канешне, дарагі!**
**— Тады паедзем на аўтобусе.**




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1499. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12